*Янкута Ганна*

# ЖАНОЧАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ ПОСТКАЛАНІЯЛЬНАГА ФЕМІНІЗМУ

*(Навуковая кіраўніца – канд. філал. навук, дац. Г. М. Бутырчык)*

У канцы 1960-х гг. на Захадзе ўзнялася другая хваля фемінізму – новы этап развіцця руху жанчын за свае правы, які доўжыўся да 1980-х гг. (паводле іншага меркавання, да 1990-х гг.), калі на змену яму прыйшоў наступны этап, трэцяя хваля. Першая хваля фемінізму асацыіравалася перадусім з суфражызмам – жаночым рухам канца XIX – пачатку XX ст. за атрыманне выбарчых правоў і за сацыяльную і палітычную роўнасць жанчын з мужчынамі, – другая ж хваля паставіла на парадак дня шырэйшае кола праблем, звязаных з палітычнымі правамі жанчын, сямейнымі адносінамі, правам на працу і г.д. У гэты час у заходнім грамадстве ўздымаюцца дыскусіі пра роўнасць жанчын і мужчын перад законам, рэпрадуктыўныя правы, жаночую сэксуальнасць, хатні гвалт. З'яўляецца лозунг «Прыватнае – гэта палітычнае» (*The Personal is Political*), які падразумявае, што ўсе аспекты прыватнага жыцця жанчыны насамрэч глыбока палітызаваныя і адлюстроўваюць сексісцкі характар структуры ўлады. Менавіта ў гэты час у навуцы зараджаюцца спачатку жаночыя і феміністскія, а пасля і гендарныя даследаванні. У прадмове да кнігі «Гісторыя феміністскай крытыкі» (*A History of Feminist Literary Criticism*) Г. Плэйн (*Gill Plain*) і С. Сэлерс (*Susan Sellers*) адзначаюць, што феміністскія даследаванні паўплывалі на такія дысцыпліны, як лінгвістыка, філасофія, гісторыя, рэлігіязнаўства, сацыялогія, антрапалогія, кіна- і медыязнаўства, культуралогія, музыказнаўства, геаграфія, эканоміка і права [11, с. 1].

У артыкуле «Праз дваццаць гадоў: пераглядаючы кнігу "Іх уласная літаратура"» (*Twenty Years On: A Literature of Their Own Revisited*) Э. Шоўалтэр (Elaine Showalter), адна з ключавых даследчыц жаночай літаратуры і класік феміністскіх літаратурных даследаванняў, напісала пра сітуацыю да другой хвалі фемінізму наступным чынам: «У 1965 годзе, калі я пісала доктарскую дысертацыю пра жанчын-пісьменніц віктарыянскай эпохі, феміністскай крытыкі не існавала. Лісты і дзённікі Вірджыніі Вулф былі неўпарадкаваныя і ненадрукаваныя. Навукоўцы ўсё яшчэ называлі Элізабет Гаскел "місіс", а Фрэнсіс Бёрні – "Фані". Не выйшла ніводнага часопіса пра жаночыя даследаванні і ніводнай бібліяграфіі жаночых твораў» [тут і далей пераклад з англійскай мовы мой. – *Г. Я.*] [12]. Э. Шоўалтэр адзначае, што ў сярэдзіне 1960-х гг. жанчыны-даследчыцы мелі абмежаваныя магчымасці рабіць акадэмічную кар'еру. Уздым другой хвалі фемінізму пацягнуў за сабой росквіт жаночай літаратуры і з'яўленне феміністскай літаратурнай крытыкі. У гэты час, як піша Э. Шоўалтэр, «жаночая эстэтыка заявіла, што жаночае пісьмо выяўляе асаблівую жаночую свядомасць, што яно ўяўляе сабой самастойную і паслядоўную літаратурную традыцыю, што пісьменніца, якая адмаўляе ці абмяжоўвае сваё жаночае "я", шкодзіць

уласнаму мастацтву» [тут і далей пераклад з рускай мовы мой. – *Г. Я.*] [9, с. 321].

Уздым другой хвалі фемінізму быў шчыльна звязаны з заходнімі краінамі, перадусім ЗША і, пазней, Заходняй Еўропай. А. Гапава характарызуе гэты перыяд наступным чынам: «Сацыяльныя змены, што пачаліся на Захадзе з канца 1960-х і былі скіраваныя на дасягненне гендарнай роўнасці, адбываліся ў перыяд, які гісторык Э. Хабсбаўм называе “залатымі гадамі” XX ст. <…> Узнікненне другой хвалі фемінізму, звязанае з выхадам істотнай колькасці адукаваных замужніх жанчын на рынак працы, было часткай гэтых змен» [4, с. 353]. Аднак ужо ў 1980-х гг. заходняя мадэль фемінізму, якая брала пад увагу перадусім патрэбы белых жанчын сярэдняга класу, пачынае крытыкавацца тэарэтыкамі з краін трэцяга свету – Гаятры Співак, Чандрай Маханці і інш. – якія адзначалі, што так званы «белы фемінізм» (*white feminism*) ігнаруе досвед жанчын-прадстаўніц іншых рас, класаў і нацыянальнасцяў. Гэта прывяло да ўзнікнення новага кірунку феміністычнай думкі – посткаланіяльнага фемінізму, што факусуецца на падвойным ціску, які цярпяць жанчыны посткаланіяльнага свету: з боку мужчын і з боку каланізатараў.

У эсэ 1988 г. «Ці могуць прыгнечаныя гаварыць?» (*Can a Subaltern Speak?*) амерыканскі філосаф і літаратуразнаўца індыйскага паходжання Гаятры Співак (*Gayatri Spivak*) уводзіць у феміністычную і посткаланіяльную тэорыю паняцце «прыгнечаныя» (*subaltern* – гэтае слова можа таксама перакладацца як «падпарадкаваныя»). Прыгнечаныя – гэта Іншыя, якія, як вызначае іх А. Гапава, «адрозніваюцца ад групы, што (у сілу гістарычных і сацыяльных прычынаў) складае ці вызначае канон» [1, с. 96]. Следам за Антоніа Грамшы (Antonio Gramsci, 1891–1937) Гаятры Співак характарызуе прыгнечаных наступным чынам: гэта тыя, «хто пазбаўлены доступу да структур размеркавання дзяржаўных даброт, каму не давяраецца абсалютна ніякай ролі ў жыцці дзяржавы» [6]. Ад нацый, прыгнечаных імперыялістычнай палітыкай «каланізатараў», Г. Співак пераходзіць да жанчыны як прыгнечанага (тут варта згадаць працу 1949 г. «Другі пол» (*Le Deuxième Sexe*) С. дэ Бавуар, якая першая прыйшла да асэнсавання жаночай гісторыі як гісторыі Іншага). У дадзеным выпадку, як адзначае А. Гапава, «феміністычныя і посткаланіяльныя тэорыі судакранаюцца, калі разглядаюць патрыярхат і імперыялізм (каланіялізм) як аналагічныя па сваім уздзеянні формы прыгнёту: досвед жанчын у патрыярхаце і досвед каланізаваных суб’ектаў шмат у чым блізкія» [3].

На пастаўленае ў назве эсэ пытанне, якое тычыцца і каланізаваных народаў, і жанчын як прыгнечанага полу, Г. Співак адказвае адмоўна: «Прыгнечаныя не могуць гаварыць [самі за сябе]» [7]. Гэта тлумачыцца тым, што ў прыгнечаных няма свайго голасу, бо яны, паводле вызначэння А. Гапавай, «бачаць сябе вачамі “каланізатара”, які заўсёды гаворыць пра іх адрозненне» [5, с. 97]. «Голас прыгнечанага будзе прачытвацца ў дыскурсе вышэйшага, так, як патрэбна вышэйшаму» [2, с. 131], – піша В. Гапеева. Менавіта таму ролю рэпрэзентантаў прыгнечаных мусяць узяць на сябе

жанчыны-інтэлектуалы, у тым ліку пісьменніцы: «Рэпрэзентацыя не адмерла. Перад жанчынай-інтэлектуалам як інтэлектуалам стаіць даволі абмежаваная задача, якую яна не павінна шырокім жэстам адкідваць» [7], – робіць выснову Г. Співак.

Працэс рэпрэзентацыі прыгнечаных ляжыць праз пошук сродкаў самавыяўлення, пошук уласнага голасу, які будзе гучаць адрозна ад голасу «каланізатара», «без аглядак на каноны і іх гаспадароў» [1, с. 98]. Жаночая літаратура як адзін са шляхоў рэпрэзентацыі і як спосаб змагання з усталяваным канонам выконвае асаблівую ролю. «Пытанне пра літаратурны канон па сутнасці ёсць палітычным – гаворка вядзецца пра ўмацаванне аўтарытэту» [8], – піша Г. Співак. Як адзначае ў артыкуле «Ангельская жаночая проза: этапы гісторыі» Н. Паваляева, «прынцыпова важным для развіцця жаночай літаратуры <…> было знайсці свой голас, свой спосаб мастацкага выяўлення свайго, жаночага погляду на свет; гэта было галоўнай умовай для фармавання такога феномену, як жаночая проза» [5]. Пошук своеасаблівага «жаночага пісьма», акрэсленне «жаночага чытання», а таксама выпрацоўка літаратуразнаўчага апарату для разумення жаночай літаратуры – усё гэта спосабы змагання за жаночую суб’ектнасць у «каланізаваным» мужчынамі свеце.

Важнасць пошуку ў жаночай літаратуры новай дыскурсіўнай прасторы, якая ўключае «новыя стылі, мадэлі аналізу і аргументацыі, новыя жанры і формы» [10, с. 23], што зробяцца інструментамі змагання з абмежаванасцю тэкстуальных магчымасцей, адзначае Э. Грос. Пісьменніцы, якія бяруць на сябе ролю рэпрэзентацыі прыгнечаных, распрацоўваюць новыя жанры і субжанры: феміністкая дыстопія (Марж Пірсі (*Marge Piercy*), Салі Мілер Герхард (*Sally Miller Gearhart*), Магарэт Этвуд (*Margaret Atwood*)), лесбійскі дэтэктыў (Барбара Уілсан (*Barbara Wilson*)) і інш. – і, як піша А. Гапава, «вынаходзяць раней забароненыя тэмы, эксперыментуюць і руйнуюць табу» [1, с. 98].

Такім чынам, крытыка фемінізму другой хвалі і яго засяроджанасці на праблемах белых жанчын пераважна сярэдняга класу прывяла да ўзнікнення фемінізму пасткаланіяльнай хвалі, ці посткаланіяльнага фемінізму, які паставіў пытанне пра прыгнечаныя класы, нацыянальнасці і, асобна, пра жанчын як прыгнечаны пол. Паколькі прыгнечаныя не могуць прамаўляць самі за сябе, бо не маюць свайго голасу, жаночая літаратура – гэта адзін са спосабаў іх рэпрэзентацыі. Уводзячы ў літаратуру новыя тэмы і новых персанажаў, якія раней былі нябачнымі або табуяванымі, шукаючы новыя жанры і стылістычныя сродкі, пісьменніцы атрымліваюць магчымасць гаварыць пра праблемы жанчын як прыгнечаных, пазбягаючы мовы «каланізатараў».

**Літаратура**

1. *Гапава А.* Жанчыны застаюцца пад кантролем, альбо Ці могуць прыгнечаныя гаварыць? / А. Гапава // Arche-Пачатак. – 2007. – № 10. – С. 96–102.

2. *Гапеева, В.* Літаратура мужчынскага роду / В. Гапеева // Arche-Пачатак. – 2007. – № 4. – С. 129–136.

3. *Гапова, Е. И.* Феминизм постколониальной волны / Е. И. Гапова [Электронный ресурс] // Режим доступа : http://www.owl.ru/gender/167.htm. – Дата доступа : 25.04.2017.

4. *Гапова, Е.* Капитализм или партиархат : заметки о распределении и признании / Е. Гапова // Классы наций : феминистская критика нациостроительства / Е. Гапова. – М. : Новое литературное обозрение, 2016. – С. 329–360.

5. *Паваляева, Н.* Ангельская жаночая проза: этапы гісторыі / Н. Паваляева ; пер. Ю. Цімафеева [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://prajdzisvet.org/articles/ critique/angelskaya-zhanochaya-proza-etapyi-gistoryii.html. – Дата доступу : 31.03.2017.

6. *Спивак, Г. Ч.* Всеобщая забастовка / Г. Ч. Спивак; пер. с англ. А. Кондакова [Электронный ресурс] // Режим доступа : http://www.nlobooks.ru/node/3419. – Дата доступа : 25.04.2017.

7. *Спивак, Г. Ч.* Могут ли угнетенные говорить? / Г. Ч. Спивак [Электронный ресурс] // Режим доступа : https://vk.com/doc180265627_318587740?hash=d0117cf37a1675b8fa&dl=c24144db6d7c685f1f. – Дата доступа : 25.04.2017.

8. *Спивак, Г. Ч.* Формирование американцев, преподавание английской литературы и будущее *cultural studies* / Г. Ч. Спивак; пер. с англ. А. Мороз [Электронный ресурс] // Режим доступа : http://www.nlobooks.ru/node/6476. – Дата доступа : 25.04.2017.

9. *Шоуолтер, Э.* Наша критика : автономность и ассимиляция в афро-американской и феминистской теории литературы / Э. Шоуолтер // Современная литературная теория: антология // сост., пер., прим. И. В. Кабановой. – М. : Флинта : Наука, 2004. – С. 314–334.

10. *Grosz, E.* Space, Time and Perversion : Essays on the Politics of Bodies / E. Grosz. – New York : Routledge, 1995. – 273 p.

11. *Plain, G., Sellers S.* Introduction / G. Plain, S. Sellers // A History of Feminist Literary Criticism / ed. by G. Plain and S. Sellers. – New York : Cambridge University Press, 2007. – P. 1–3.

12. *Showalter E.* Twenty Years On : A Literature of Their Own Revisited / E. Showalter [Electronic resource]. – Mode of access : http://l-adam-mekler.com/show_twenty_years_on.pdf. Date of access : 31.03.2017.